где до сих пор занимаются подготовкой высококвалифицированных библиотечных кадров. [1]

Библиотеки университетов как в Великобритании, так и в Беларуси прошли долгий путь развития, концептуально менялись и реорганизовывались для того, чтобы сделать свои услуги полезными для современного пользователя. Реагируя на возникающие информационные потребности, из хранилища документов библиотеки превратились в учреждения, где формируются новые знания. Университетские библиотеки являются самыми динамичными, подстраиваясь под интересы студентов, стараются быстро реагировать на изменения в сфере образования. Наряду с традиционным направлением деятельности — информационным обеспечением образовательного и научного процессов, библиотеки проводят огромную работу для продвижения университетов в международных рейтингах, сохраняя и транслируя в мировое информационно-научное пространство их наследие.

СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. Бібліятэказнаўства. Гісторыя: вучэбна-метадычны комплекс / Л.І. Доўнар. – Мінск: БДУКМ, 2017. – 245 с.

2. Cambridge University Library [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.lib.cam.ac.uk/about-library. – Date of access: 10.03.2021

3. University of Cambridge [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.britannica.com/topic/University-of-Cambridge. – Date of access: 10.03.2021

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Винничек В. В., студент 231 группы

Научный руководитель – Саитова В. И.,

кандидат педагогических наук, доцент

**РЭКАМЕНДАЦЫЙНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ**

# ІНСТРУМЕНТЫ ЛІЧБАВАЙ КНІЖНАЙ ПЛАТФОРМЫ

Рэкамендацыйная бібліяграфія – гэта адметная з’ява ў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. За гэтым відам бібліяграфіі трывала замацавалася забеспячэнне спажыўцоў бібліяграфічнай інфармацыяй з улікам іх дыферэнцыраваных патрэбнасцей у сферы адукацыі, самаадукацыі, выхавання і аматарскага чытання. Вядома стварэнне выдатных рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў у розных краінах, якія ў мінулым ствараліся вучонымі, бібліятэкарамі, кнігавыдаўцамі і гандлёўцамі. У сучасных умовах пад уплывам імклівага развіцця тэхналогій, хуткага росту аб’ёмаў інфармацыі і дзіджыталізацыі, значнасць рэкамендацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці не толькі не паменьшылася, але раскрываюцца яе новыя магчымасці.

Рэкамендацыйная бібліяграфія адыгрывае значную ролю ў выхаванні светапогляду чалавека, яго павагі да роднай культуры і спадчыны сваёй краіны, жадання да самаадукацыі. Але трэба правільна кіраваць працэсам падбору літаратуры і рэкамендацыі яе чытачам, каб не страціць каштоўнага вопыту, як гэта было ў савецкі час, калі тэрмін “рэкамендацыйнай бібліяграфіі” быў амаль страчаны.

Сёння бібліятэкам важна прапагандаваць “айчыннага вытворца”, каб выхоўваць ў дзецях і дарослых любоў і павагу да роднай краіны, мовы і культуры. У падрастаючага пакалення трэба абуджаць цікавасць да беларускай літаратуры, а ў Інтэрнэт прасторы часцей сустракаецца рэклама літаратуры замежнай, “бэстсэллераў” амерыканскіх, рускіх, англійскіх і іншых пісьменнікаў.

У наш час дзіджэтал-асяроддзе і тэхналогіі змяняюць рэсурсы рэкамендацыйнай бібліяграфіі і яе сэрвісныя механізмы. У патоку рэкамендацыйнай бібліяграфічнай прадукцыі з’явіліся новыя жанры (энцыклапедыі, праекты, віртуальныя выставы, падкасты, буктрэйлеры і інш.), якім уласцівы мульцімедыйнасць, аператыўнасць, разнастайнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кропак уваходу, даступнасць і іншыя важныя перавагі ў працэсе выкарыстання [1].

Асобнай увагі заслугоўваюць новыя магутныя рэсурсы – нацыянальныя кніжныя платформы, якія аб'ядноўваюць мноства інфармацыйных рэсурсаў краіны і дазваляюць карыстацца інфармацыяй у аддаленым доступе. Ва ўмовах пандэміі, у якой краіны знаходзяцца ўжо больш за год, не заўсёды можна ажыццяўляць пошук неабходных крыніц інфармацыі па бібліятэках, кніжных выставах, кнігарнях і інш. Многія работнікі сферы навукі і адукацыі, вымушаныя працаваць у дыстанце, часта не маючы доступу да таго ці іншага інфармацыйнага рэсурсу, які можа стаць вырашальным у напісанні навуковых прац. Таксама кожны чалавек можа сустрэцца з няведаннем пра існаванне таго ці іншага рэсурса, напрыклад, таму, што дакумент даволі стары, ці наадварот, ён выдадзены зусім нядаўна. Акрамя гэтага бібліятэкі ва ўсім свеце імкнуцца павышаць узровень чытання, жадання чытаць, таму рэкамендацыйна-бібліяграфічныя інструменты адыгрываюць вялікую ролю ў тым, што бібліятэкары выхоўваюць у дзецях і развіваюць у дарослых. Гэта падымае попыт на стварэнне адзінага рэкамендацыйна-бібліяграфічнага апарату, з дапамогай якога магчыма ажыццяўляць пошук артыкулаў, часопісаў і кніг. Менавіта таму нацыянальная кніжная платформа з поўным наборам рэкамендацыйна-бібліяграфічных інструментаў – гэта тое пытанне, якое абмяркоўваюць работнікі інфармацыйнай і культурнай сфер, каб забяспечыць зручнасць і функцыянал дыстанцыйнай працы з кніжнымі рэсурсамі, а таксама аптымізаваць працэс навучання інфармацыйнай культуры школьнікаў і студэнтаў [2]. Нам трэба рагледзець, што такое рэкамендацыйна-бібліяграфічны апарат платформы ў цэлым, як ён працуе і ці патрэбен ён для чытачоў і супрацоўнікаў бібліятэк, кніжных магазінаў і розных інтэрнэт парталаў.

У наш час трэба звярнуць увагу менавіта на лічбавае асяроддзе і тое, як магчыма стварыць платформу з рэкамендацыйна-бібліяграфічнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інструментамі, якія будуць зручнымі для ўсіх узростаў і груп насельніцтва, незалежна ад таго, якую інфармацыю яны жадаюць атрымаць пры выкарыстанні платформы. Праведзены даследаванні, якія былі накіраваны на тое, каб дазнацца, які фармат рэкамендацый будзе працаваць лепш за ўсё, ці спадабаецца чытачам бібліятэк даныя сэрвісы і што з’яўляецца іх прыярытэтам. “Вялікай годнасцю ў вачах карыстальнікаў з'яўляецца фізічная даступнасць інфармацыі, лёгкі пошук, наяўнасць мабільнай версіі прыкладання...” [1] Але каб стварыць нейкую ідэальную мадэль будучай платформы, трэба пазнаёміцца з вопытам другіх краін, якія даўно і паспяхова карыстаюцца такімі кніжнымі платформамі, дзейнасць якіх накіравана на тое, каб скласці найбольш поўную і зручную рэкамендацыйна-бібліяграфічную базу.

Наглядным прыкладам падобнай працы з’яўляецца Канадская кніжная платформа BookNet Canada, якая была створана ў 2002 годзе і працуе па сённяшні дзень. Цікава тое, што фінансуецца арганізацыя Дэпартаментам культурнай спадчыны, гэта адлюстроўвае стаўленне да культуры ў краіне. Арганізацыйную структуру кампаніі прадстаўляюць людзі з розных арганізацый кніжнай галіны, прафесіяналаў у вобласці кнігагандлю, выдавецтва, бібліяграфіі і бібліятэказнаўства. Кампанія ажыццяўляе ўсе працэсы, звязаныя з выдавецтвам, гандлем, распаўсюджваннем кніг, вывучэннем новых тэндэнцый і інтарэсаў чытачоў. На аснове гэтай работы ствараюцца і папаўняюцца рэкамендацыйна-пошукавыя інструменты.

BookNet Canada мае рэсурс, які вывучае кнігавыдачу ў канадскіх публічных бібліятэках, каб стварыць спіс найбольш цікавай для чытачоў літаратуры па жанрах, тэмах, аўтарах і іншых крытэрыях чытацкага попыту. Гэта трэба для таго, каб бібліятэкі ведалі, на што яны патрэбны звярнуць увагу пры заказе кніг, праверцы фондаў, падрыхтоўцы кніжных выстаў і рэкамендацыі літаратуры чытачам.

Акрамя гэтага кампанія таксама збірае даныя аб выдавецтвах, распаўсюджвае бібліяграфічную інфармацыю, займаецца электроным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абменам данымі. “Паслугі і даследаванні BookNet Canada дапамагаюць кампаніям ажыццяўляць прамоцыю і прадаваць кнігі, аптымізаваць працоўныя працэсы, аналізаваць і адаптавацца да хутка змяняемаму рынку. BookNet Canada ўсталёўвае тэхналагічныя стандарты і навучае арганізацыі таму, як іх прымяняць, праводзіць маркетынгавыя даследаванні і адсочвае 85% усіх продажаў англамоўных канадскіх друкаваных кніг праз BNC SalesData.” [3]. Асноўнымі тэхналагічнымі блокамі лічбавай платформы з’яўляюцца агрэгатар метаданых BiblioShare, інструмент электроннага каталога для маркетынгу, продажу і заказу кніг CataList, нацыянальная служба аналізу кнігапродажу на англамоўным сегменце канадскага кніжнага рынку SalesData, інструмент для аналізу калекцый бібліятэк LibraryData [3]. Для бібліятэкараў цікавы штомесячны рэкамендацыйны спіс лепшых прапаноў Loan Stars. У гэтым рэсурсе будучых кніжных “зорак” выдаўцы змяшчаюць назвы, урыўкі з твораў, якія з’явяцца ў друку праз два месяцы. Такая работа “наперад” дазваляе бібліятэкам своечасова зрабіць заказ, падрыхтаваць агляды кніг, якія цікавяць чытачоў, быць гатовымі да вусных рэкамендацый. Для Loan Stars Jr. (юных чытачоў) падобныя рэкамендацыйныя спіскі рыхтуюцца раз у два месяцы. Відавочна, што рэкамендацыйна-бібліяграфічныя інструменты платформы BookNet Canada арыентаваны на падтрымку рэкамендацыйна-бібліяграфічнай кампетэнтнасці бібліятэкараў.

Многія інтэрнэт-рэсурсы, звязаныя з кніжным гандлем, распаўсюджваннем кніг і г.д. маюць нешта падобнае да рэкамендацыйна-бібліяграфічных інструментаў. Пры першым звяртанні, праграма “знаёміцца” з чытачом, каб сабраць інфармацыю для рэкамендацый пры наступных звяртаннях да сэрвіса. Рэкамендацыі становяцца больш дакладнымі па меры аналізу праграмай чарговых пошукавых дзеянняў карыстальніка і яго ацэнак.

Нажаль у Беларусі яшчэ не існуе адзінай лічбавай кніжнай платформы, якая збірае інфармацыю з усіх беларускіх выдавецтваў, бібліятэк, кніжных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

магазінаў і выставаў, аналізуе гэтую інфармацыю, састаўляе спіс найбольш папулярных кніг, дакументаў, якія часцей за другія бяруць у бібліятэках і заказваюць у інтэрнэт-магазінах і на аснове ўсяго аб'ёму собранай і прааналізаванай інфармацыі, даюць дакладную, патрэбную і поўную рэкамендацыю бібліятэкам, інтэрнэт-сэрвісам і іх карыстальнікам асабіста. Але прыклад іншых краін раскрывае патэнцыял рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў сучасным грамадстве і перавагі рэкамендацыйна-бібліяграфічных сэрвісаў нацыянальных кніжных платформаў у прамоцыі кнігі і чытання. Насельніцтва Беларусі актыўна карыстаецца Інтэрнэтам і сацыяльнымі сеткамі, таму стварэнне нацыянальнай лічбавай кніжнай платформы, якая аб'яднае ўсіх суб'ектаў кніжнай культуры з развітым рэкамендацыйна-бібліяграфічным механізмам будзе садзейнічаць пашырэнню чытання беларускай літаратуры.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ:

1. Брежнева, В.В. Рекомендательная библиография – новые векторы развития в цифровой среде / В. В. Брежнева // Библиография. – 2020. – Вып. 6. – С. 4-14.

2. Национальная книжная платформа: стратегия развития / Университетская книга. –2020. – Сентябрь. – С. 28-33

3. BookNet Canada : website [Электронный ресурс]. Режим доступа : https://www.booknetcanada.ca/about-us. – Дата доступа: 1.03.2021.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Винцковская Н. В., студент 212 группы

Научный руководитель – Житкевич Е. Н., преподаватель

## КУЛЬТУРНО-ДОСУГОВАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ КАК СРЕДСТВО РАЗВИТИЯ СОЦИАЛЬНОЙ АКТИВНОСТИ ПОДРОСТКОВ